развіццё адчування мовы, моўнай інтуіцыі, на назапашванне імі станоўчага маўленчага вопыту.

Такім чынам, выкарыстанне сістэмы практыкаванняў садзейнічае развіццю не толькі пазнавальнай цікавасці, але і мысліцельных здольнасцяў вучняў пачатковых класаў. Хоць праца і носіць прапедэўтычны характар, аднак яна з'яўляецца надзейнай базай для паглыбленага і сістэматычнага вывучэння фразеалагічных адзінак на наступнай ступені атрымання агульнай сярэдняй адукацыі.

**Канцавая Г.М., Шульган В.С.**
(*Брэст, УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна»*)

## РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕНЧАЙ КУЛЬТУРЫ ВУЧНЯЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

Павышэнне ўзроўню маўленчай культуры з'яўляецца актуальнай праблемай сучаснага грамадства. Маўленчы этыкет дапамагае праяўляць добразычлівасць у адносінах да субяседніка. Няведанне ж правіл маўленчых этыкетных зносін абцяжарвае працэс камунікацыі. На думку Н.І. Фарманоўскай і Т.А. Ладыжанскай, менавіта веданне маўленчага этыкету з'яўляецца фундаментам, асновай для далейшага фарміравання маўленчай культуры вучняў [1; 2].

Нізкі ўзровень культуры маўленчых паводзін сучасных школьнікаў прыводзіць да зніжэння агульнай культуры вучняў.  У цэлым памылкі, звязаныя з маўленчымі паводзінамі малодшых школьнікаў, можна падзяліць на наступныя: 1) адсутнасць у маўленні прынятых у грамадстве маўленчых формул (напрыклад, вучань, прыходзячы ў клас, не вітаецца, а адыходзячы дадому, не выкарыстоўвае найпрасцейшыя формулы падзякі і выбачэння); 2) няправільны выбар формулы ў пэўнай маўленчай сітуацыі (вучань, развітваючыся, гаворыць настаўніку «Бывайце!», «Усяго!»); 3) выкарыстанне слоў, якія маюць грубую і негатыўную афарбоўку (выкарыстанне вучнямі ў форме прывітання слова «Здарова!»; расселася замест «села» і інш.); 4) няправільна выбраная інтанацыя (маўленчы этыкет прадугледжвае шчырасць і добразычлівасць у выкарыстанні формул. Часта школьнікі прагаворваюць формулы прабачэння, падзякі ці кампліменты з нядобразычлівай інтанацыяй і ідавочным нежаданнем выклікаць у субяседніка станоўчыя эмоцыі).

Павышэнне культуры паводзін і зносін дзяцей з'яўляецца найважнейшай педагагічнай задачай, і найлепшы спосаб выхавання ў вучняў пачатковых класаў нарматыўных маўленчых паводзін – гэта

стварэнне неабходнага маўленчага асяроддзя, падтрыманне атмасферы павагі і добразычлівасці.

Як ніколі востра сёння паўстае пытанне аб рашэнні дзвюх найважнейшых задач – павышэння ўзроўню маўленчай культуры вучняў і ўдасканалення іх правапісных уменняў – у арганічным адзінстве. Відавочна, што адной з найважнейшых умоў фарміравання арфаграфічных уменняў з'яўляецца павышэнне маўленчай культуры вучняў. Толькі развітае маўленне прыводзіць да патрэбнасці яго правільнага арфаграфічнага афармлення. Выкарыстанне тэксту ў пэўнай ступені дазваляе рашыць сфармуляваную задачу – фарміраваць правапісныя і маўленчыя навыкі ў адзінстве. Тэксты для спісвання рэкамендуецца падбіраць з улікам агульнага развіцця малодшых школьнікаў, ступені сфарміраванасці ў іх навыкаў правапісу, узроўню развітасці маўленчай культуры. Пры арганізацыі спісвання неабходна накіраваць увагу вучняў на асэнсаванне зместу тэксту, яго кампазіцыйнага члянення, стылістычнай характарыстыкі. З гэтай мэтай практыкаванні на спісванне тэксту павінны суправаджацца заданнямі наступнага характару: пераказ запісанага тэксту; складанне яго плана; вызначэнне асноўнай думкі; азагалоўванне тэксту; вызначэнне ролі тых ці іншых моўных сродкаў у перадачы зместу, у кампазіцыйным чляненні тэксту, у стварэнні адпаведнай стылістычнай афарбоўкі і г.д.

З элементарнымі паняццямі аб культуры маўлення дзеці знаёмяцца дома, у дзіцячым садку і ў пачатковай школе. Фарміраванне навыкаў маўленчага этыкету – неад'емная частка агульнай працы па развіцці маўлення вучняў пачатковых класаў. Асноўным накірункам працы з'яўляецца ўзбагачэнне маўлення малодшых школьнікаў словамі і канструкцыямі, неабходнымі ў паўсядзённых зносінах паміж людзьмі. Увядзенне ў маўленне вучняў пачатковых класаў этыкетных сродкаў не толькі ўзбагачае іх актыўны слоўнік, але і выхоўвае ўважлівыя, удумлівыя адносіны да ўжывання гэтых форм і выразаў у маўленні, уменне выбіраць моўныя сродкі, больш дарэчныя ў канкрэтнай маўленчай сітуацыі. Правілы этыкету – экспазіцыя ў сістэме фарміравання культуры маўленчых зносін. Маўленчы этыкет пачынаецца з прывітання, з «ветлівых» слоў, і тут на дапамогу можа прыйсці паэзія: *«Калі ласка», «дзякуй», «добры дзень» – ветлівыя словы чую ад людзей. Ветлівымі словамі трэба даражыць. З ветлівымі словамі лёгка жыць* (Т. Кляшторная). Прывучаючы дзяцей бачыць «дабро» кожнага слова, настаўнік павінен паказаць ім сферу выкарыстання займеннікаў *ты* і *вы.*

Найважнейшая задача настаўніка – закласці асновы правільнага маўлення. Настаўнік павінен мець дакладныя ўяўленні аб культуры

маўлення, моўных нормах і прыёмах іх фарміравання. Безумоўна, маўленчая культура самога настаўніка павінна быць таксама высокая.

Вучэбнай праграмай па беларускай мове не прадугледжваюцца спецыяльныя ўрокі па тэме «Маўленчы этыкет». Неабходныя звесткі засвойваюцца ў пачатковых класах паралельна з арфаграфічным і граматычным матэрыялам. Навучанне малодшых школьнікаў беларускаму маўленчаму этыкету мае на мэце: 1) узбагачэнне слоўніка вучняў адзінкамі маўленчага этыкету; 2) удакладненне значэння адзінак маўленчага этыкету; 3) актывізацыю адзінак маўленчага этыкету як часткі слоўніка вучняў пачатковых класаў; 4) навучанне выбару адзінак маўленчага этыкету ў залежнасці ад сітуацыі зносін; 5) навучанне разгортванню (згортванню) формул маўленчага этыкету ў адпаведнасці з сітуацыяй зносін.

Настаўніку пачатковых класаў неабходна пазнаёміць вучняў з паняццем маўленчага этыкету, з этыкетнай лексікай як асобым пластом слоўніка, растлумачыць неабходнасць быць ветлівым у зносінах з людзьмі. На практычным канкрэтным матэрыяле малодшыя школьнікі павінны патрэніравацца ў правільным, дарэчным ужыванні асобных этыкетных формул прывітання, развітання, просьбы, падзякі і г.д. у залежнасці ад маўленчай сітуацыі. Настаўнік можа паставіць перад вучнямі пытанне: «Вы сказалі сустрэчнаму «Добры дзень!» Многа гэта ці мала?» (вучні выказваюць свае меркаванні). З адгаго боку, як быццам нямнога, таму што звестак перададзена не было. Аднак, з другога боку, кожны ведае, як непрыемна ўражвае нас і нават раніць адсутнасць чакаемага прывітання. Настаўніку пажадана правесці з вучнямі гутарку аб маўленчым этыкеце, паведаміўшы, што маўленчыя паводзіны – гэта люстэрка, якое паказвае ўзровень выхаванасці, унутранай культуры чалавека. Толькі добразычлівыя адносіны да субяседніка пабуджаюць чалавека выразіць сваю прыязнасць, добразычлівасць з дапамогай славесных знакаў увагі.

Правільнае выкарыстанне слоў маўленчага этыкету мае прамыя адносіны да культуры чалавека. Пажадана пазнаёміць вучняў з некаторымі элементамі маўленчай сітуацыі, папрацаваць са схемай, *каму пра каго (што) хто гаворыць і дзе, калі, чаму і навошта.* Працуючы па гэтай схеме, малодшыя школьнікі выяўляюць, што змяненне якога-небудзь элемента вядзе і да змянення этыкетнай маўленчай формулы: каму: сябру – *прывітанне!;* настаўніку – *добры дзень!*

Адпрацоўка нормаў маўленчага этыкету звязваецца з вывучэннем праграмнага матэрыялу па беларускай мове: вылучаюцца тэмы, з якімі цесна звязаны правілы маўленчага этыкету. Да такіх тэм адносяцца займеннік, назоўнік, дзеяслоў, прыметнік.

У прывіцці вучням пачатковых класаў этыкетнага навыку дапамагае стварэнне маўленчых сітуацый, складанне дыялогаў на такія тэмы, як «На ўроку», «Размаўляем па тэлефоне» і інш. Такія маўленчыя сітуацыі выкарыстоўваюцца і для прывіцця вучням навыкаў правільнага, слушнага адбору формаў прывітання, развітання, правільнага выкарыстання формаў займеннікаў, дзеясловаў, знакаў ветлівага звароту. Асаблівая ўвага надаецца тону зносін, інтанацыі, жэстам, манеры трымацца. Дзіця 6–7 гадоў, як правіла, звяртаецца да незнаёмага чалавека на «Вы». Значыць, у многіх выпадках ужо першакласнік выбірае з шэрагу формаў правільныя, дарэчныя для тых ці іншых абставін формулы маўленчага этыкету. Таму на ўроках беларускай мовы на першы план выступае: а) уменне выбіраць аптымальную, дарэчную для пэўнай сітуацыі зносін формулу маўленчага этыкету; б) уменне «разгортваць» устойлівую формулу маўленчага этыкету. Апошняе асабліва істотнае, так як менавіта «разгортванне» менш стандартнае і сведчыць не толькі пра веданне маўленчых этыкетных формул, але і пра пэўны ўзровень выхаванасці вучня.

Добразычлівая ўсмешка, інтанацыя, міміка таксама адыгрываюць важную ролю пры зносінах. Паралельна фарміруецца правільнасць маўлення – захаванне моўных нормаў беларускай літаратурнай мовы (фанетычных, лексіка-фразеалагічных, марфалагічных, сінтаксічных, стылістычных). Другі бок фарміравання культуры маўлення – гэта маўленчае майстэрства. Часта ў водгуках аб стылі пісьменнікаў можна пачуць: «Якая багатая мова!» Самы першы крытэрый – колькасць слоў, аднак нельга забываць і пра мнагазначнасць слова. Так, пры вывучэнні раздзела «Слова» перад вучнямі пачатковых класаў адкрываюцца невычэрпныя магчымасці словаўжывання. Дыдактычныя гульні-практыкаванні развіваюць памяць, увагу, кемлівасць, агульны кругагляд. Вядучае месца ў працы па развіцці маўлення займае славесная творчасць вучняў. Найбольш прыдатным відам літаратурных твораў лічацца невялікія апавяданні і пісьмы.

Чытанне з’яўляецца неабходным кампанентам навучання беларускай мове ў школе. Методыка развіцця маўлення вучняў на аснове чытання і аналізу прачытанага распрацавана ў даследаваннях вучоных і метадыстаў і рэалізавана ў той ці іншай ступені ў практыцы выкладання. У працэсе навучання чытанню актывізуюцца і ўдасканальваюцца найважнейшыя маўленчыя механізмы: механізм памяці, механізм антыцыпацыі (прадбачання), механізм эквівалентных замен («пераклад» прачытанага на свае словы, пераказ сваімі словамі і г.д.). Каб усе магчымасці чытання былі рэалізаваны ў практыцы школьнага навучання, неабходна праводзіць сістэматычную, мэтанакіраваную працу, якая забяспечвае ўдасканаленне

ў вучняў пачатковых класаў умення чытаць. Навучанне чытанню дазваляе адпрацаваць некаторыя бакі чытання як віду маўленчай дзейнасці, зрабіць чытанне больш эфектыўным. Тэксты, якія прапануюцца настаўнікам на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання, актывізуюць мысліцельную, а значыць, і маўленчую дзейнасць малодшых школьнікаў, садзейнічаюць развіццю камунікатыўна-маўленчых уменняў, удасканаленню найважнейшых механізмаў маўлення.

Такім чынам, у якасці асноўных прыёмаў выхавання культуры маўленчых паводзін у вучняў пачатковых класаў неабходна выкарыстоўваць тыя, якія ў максімальнай ступені мадэлююць блізкія для іх жыццёвыя сітуацыі, якія дапамагаюць вучням рабіць правільны выбар паводзінскіх прынцыпаў. Неабходна для кожнага вучня стварыць умовы практычнай дзейнасці, бо менавіта яна неабходная малодшаму школьніку для набыцця навыкаў культуры маўленчых паводзін, для замацавання і рэалізацыі атрыманых ведаў.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Формановская, Н. И. Речевой этикет и культура общения / Н. И. Формановская. – М. : Высш. шк., 2005. – 159 с.

2. Ладыженская, Т. А. Методика развития речи / Т. А. Ладыженская. – М. : Просвещение, 2001. – 298 с.

**Касцючык В.М.**
(*Брэст, УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна»*)

## ОНІМЫ ЯК СРОДАК РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ МОЎНАЙ КАРЦІНЫ СВЕТУ Ў ТВОРАХ УЛАДЗІМІРА ГНІЛАМЁДАВА

«Моўная карціна свету, – як лічыць В. Крылова, – уяўляе сабой гістарычна складзеную ў свядомасці дадзенага моўнага калектыву і адлюстраваную ў мове сукупнасць уяўленняў пра свет» [5, с. 105]. Вядома, яна з’яўляецца вынікам развіцця этнасу і перадаецца наступным пакаленням праз асаблівае светабачанне, правілы паводзін, лад жыцця, выяўленыя праз моўныя сродкі.

Каштоўнай крыніцай вывучэння моўнай карціны свету – гісторыі і культуры народа, яго менталітэту – выступаюць онімы. Праз іх акаляючы свет паўстае не столькі аб’ектыўнай сфатаграфаванай рэчаіснасцю, колькі яе суб’ектыўным светаўспрыманнем носьбітам пэўнай традыцыі, якая мае этнічнае, сацыяльнае і культурнае выяўленне.

Онімы рэпрэзентуюць таксама і моўную карціну пісьменніка, што «ўяўляецца як індывідуальна і творча вербалізаванае ўяўленне пра свет, прапушчанае праз прызму свядомасці аўтара, унутраная духоўная